•красавік • 2010 •

# MAkAsIN




## ШОУ НА ЛЬДУ

*...в действиях руководства нашего университета четко прослеживаются государственные тенденции...*

## ФОТОГРАФИЯ ПО-УНИВЕРСИТЕТСКИ

*Все-таки университет должен оставаться университетом...*

стар.4

## ГРЯДУЩЕЙ ВАЛЬПУРГИЕВОЙ НОЧИ ПОСВЯЩАЕТСЯ

*а почему, собственно, такая мирная святая связалась со всем эти непотребием...*

стар.7

## БЕЛАРУСКАЕ СВЯТА Ў ГОНАР МЯДЗВЕДЗЯ

*Існавала прыкмета: калі мядзведзь, разбуджаны веснавым цяплом, выйдзе з бярлогі і ўбачыць свой цень...*

стар.8

# INFO

• «Белтэлекам» знізіў кошты для інтэрнэт-правайдэраў на 25 %

• Беларускі дыктатар заявіў, што зрынуты Курманбек Бакіеў застаецца для яго «законна абраным прэзідэнтам».

• Улады заяўляюць, што ім не патрэбны новы крэдыт ад МВФ.

• Акцыя ў падтрымку палітвязьня Мікалая Аўтуховіча прайшла ў Дзень салідарнасці 16 красавіка ў Салігорску.

• 16 красавіка, у Дзень салідарнасці з сем'ямі выкрадзеных і палітвязнямі, у цэнтры Віцебска быў вывешаны бел-чырвона-белы сцяг.

• Беларускі кіраўнік заявіў, што будзе пашыраць узаемавыгаднае супрацоўніцтва з Сірыяй.

• Беларусь стабільна займае першыя месцы ў рэйтынгу краінаў-ворагаў Інтэрнэту, які штогод складае арганізацыя «Рэпарцёры без межаў».

• У Берліне прадаюць марыянетку Лукашэнкі за 7.90 еўра.

• У Мастах прайшлі ператрусы ў дамах кандыдата ў дэпутаты ад апазіцыі Аляксандра Зарэмбюка і яго бацькоў.

• Каля гарадскога пасёлка Руба побач з Віцебскам на электрычных дратах пад напругай 110 тысячаў вольт з'явіўся нацыянальны сцяг Беларусі.

• Амапаўцы арыштавалі моладзевых актывістаў, якія спрабавалі перадаць БРСМ відэазапіс пра тое, як Лукашэнка хваліць Гітлера.

• СБУ Украіны перадала беларускай апазіцыі звесткі аб рэпрэсаваных у 20-30-х гадах.

• Ізноў перад выбарамі адміністрацыя выклікае жыхароў бабруйскіх інтэрнатаў і кажа ім за каго галасаваць.

• Часовы ўрад Кыргызтана заклікае заблакаваць сродкі, выведзеныя за мяжу атачэннем Курманбека Бакіева.

***www.charter97.org***

# КОНКУРС НА ДАСЬЛЕДЧЫЯ ГРАНТЫ

***ЭГУ і праграма «Сацыяльныя трансфармацыі ў Памежжы (Беларусь, Украіна, Малдова)» пры фінансавай падтрымцы Карпарацыі Карнэгі, Нью-Ёрк ды адміністратыўным садзеяньні Амэрыканскіх Радаў па міжнароднай адукацыі(ACTR/ACCELS) абвесьцілі конкурс на атрыманьне грантаў для правядзеньня індывідуальных і калектыўных дасьледваньняў у межах праграмы.***

Мэта конкурсу – аказаньне матэрыяльнай, навуковай, мэтадычнай, інфармацыйнай падтрымкі ў вывучэньні сацыяльнай трансфармацыі ў кантэксьце Памежжа дасьледчыкамі ды выкладчыкамі зь Беларусі, Украіны й Малдовы.

Прыярытэтамі конкурсу зьяўляюцца наступныя праблемы:

– Сусьветны эканамічны крызіс як «новы палітычны гулец»: паліталягічныя прагнозы сярэднетэрміновай пэрспэктывы.

– Беларусь, Украіна й Малдова ў кантэксце эўрапейскай ініцыятывы: выклік Усходняга Партнэрства.

– Вышэйшая школа: практыкі трансфармацыі ва ўмовах соцыюма, які трансфармуецца.

– Пасьля Акадэміі Навук: лёсы навуковых інстытуцыяў у пост-савецкай Усходняй Эўропе.

– Інтэлектуалы і ВАК: палітыка ведаў і новыя рэаліі акадэмічнай кар'еры.

– Мовы сучасных сацыяльных й гуманітарных ведаў: рэгіянальны кантэкст у заходнеэўрапейскай пэрспектыве.

– Антрапалёгія постсавецкай штодзённасьці: аблічча беднасьці.

– Антрапалёгія постсавецкай штодзённасьці: міграцыя як адапціўная стратэгія.

– Этнічнасьць, рэгіяналізм і нацыяналізм ва Ўсходняй Эўропе: «новыя» ды «старыя» меньшасьці ў кантэксьце ідыялёгіяў нацыянальнага будаўніцтва.

– «Энэргетычная бясьпека» ды новыя стратэгіі палітычных элітаў Усходне-Эўрапейскага Памежжа.

– «Сэк'юрытызацыя» інфармацыйна-камунікацыйнай сфэры й кансалідацыя ўлады ў краінах Усходняй Эўропы.

– Ідэялёгія антыглябалізму ва Ўсходняй Эўропе: культурны рэлятывізм і канцэпцыя «трэцяга шляху».

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца дасьледчыкі з краінаў рэгіёну. Пераможцы атрымаюць гранты на правядзеньне навуковых дасьледваньняў цягам 10 месяцаў.

Заяўкі дасылайце на адрас: case@ehu.lt

Апошні тэрмін падачы заявак: 15 траўня 2010 году.

Па заяўку можна звярнуцца да нас hazeta@gmail.com.

***Паводле рассылкі belngo.info***
***крыніца: n-europe.eu***

# НАВУЧАЛЬНЫ ВІЗЫТ У ГДЫНІ

***Польская няўрадавая арганізацыя «Цэнтар Супрацоўніцтва Моладзі», Гдыня, у супрацоўніцтве з Гарадзкой Радай г. Гдыня абвяшчаюць набор удзельнікаў на два чарговых выпускі праграмы «Навучальныя Візыты ў Гдыні».***

**4-15 кастрычніка 2010 і 2-13 лістападу 2010.**

Падчас навучальнага візыту ўдзельнікі пазнаёмяцца з Польшчай, даведаюцца больш аб адміністратыўнай ды адукацыйнай сыстэмах, а таксама аб урадзе, бізнэсе, СМІ, дзяржаўных ды недзяржаўных арганізацыях, польскай культуры, гісторыі ды іншым.

У межах праграмы будуць арганізаваныя сэмінары, майстар-клясы, экскурсіі ў Гдыню, Гданьск, Сопат ды іншыя гарады.

Да ўдзелу запрашаюцца маладыя, актыўныя на мясцовым узроўні, ініцыятыўныя студэнты альбо прадстаўнікі грамадзкіх арганізацыяў ва ўзросьце 18-25 год зь Беларусі, Малдовы, Украіны й Грузіі.

Арганізатары кампэнсуюць выдаткі на праезд, пражываньне, харчаваньне, страхоўку і 50-70 % кошту візы.

Каб прыняць удзел, неабходна запоўніць форму анкеты й даслаць яе па адрасе: civic.cwm@gmail.com

Апошні тэрмін падачы заявак: 25 красавіка 2010 году.

Адабраныя кандыдаты атрымаюць пацьверджаньне па эл. пошце, а таксама дэталёвую інфармацыю аб датах і праграме стажыроўкі, запрашэньне для візы. Сьпіс удзельнікаў будзе апублікаваны на сайце: www.cwm.org.pl

***Паводле рассылкі belngo.info***

## В Бельгии и Франции могут запретить паранджу

***Наказание за ношение паранджи, может оказаться достаточно суровым – до одного года тюрьмы.***



Комиссия по внутренним делам Палаты представителей Бельгии рассмотрит в среду законопроект запрещающий закрывать лицо в общественных местах. Если закон будет принят, изменения внесут в уголовный кодекс страны.

Ношение мусульманского платка тоже оказывается вне закона. Так, учительницу математики в Шарльруа (городе на юге Бельгии) не пускают в платке в школу. Таково решение муниципального совета. Если в течение десяти дней педагог не пойдет на уступки, она может потерять работу.

Во Франции вопрос о ношении паранджи вызвал острые дебаты. Государственный совет страны не рекомендует вводить полный запрет, так как это противоречит Конституции и конвенции ЕС по правам человека. Однако, сторонники Николя Саркози, собираются представить соответсвующий законопроект в Парламент.

Государственный Совет Франции рекомендует запретить ношение паранджи частично, например, в тех местах, где необходимо устанавливать личность: в банках и на избирательных участках.

Мужей, которые будут принуждать к ношению паранджи, предполагается отправлять за решетку.

## Бібліятэка ў Нью-Ёрку: Джордж Вашынгтон не вярнуў кнігі

***Супрацоўнікі найстарэйшай бібліятэкі ў Нью-Ёрку выявілі, што за першым прэзідэнтам ЗША Джорджам Вашынгтонам да гэтага часу лічацца дзве кнігі, якія ён не вярнуў у 1789 г.***

Джордж Вашынгтон застаўся ў амерыканскай гісторыі як чалавек, які ніколі нікога не падманваў. Але відавочна, ён усё ж быў не пазбаўлены асобных недахопаў.

5 кастрычніка 1789 года Вашынгтон прыйшоў у адзіную ў тыя часы бібліятэку на Манхэтэне і ўзяў два тамы: трактат аб міжнародных стасунках «Права нацый» і зборнік пратаколаў дэбатаў у брытанскай палаце грамадаў.

Сам ён распісвацца ў фармуляры не стаў, але яго памочнік напісаў «прэзідэнт».

Вярнуць кнігі Вашынгтон павінен быў праз месяц. Але не вярнуў. Бібліятэкары выявілі знікненне толькі нядаўна, алічбоўваючы ўліковыя карткі таго часу.

У прынцыпе, за невяртанне узятых кніг у тэрмін належыць штраф – і за 220 гадоў, з папраўкай на інфляцыю, павінна было набегчы 300 тысяч даляраў. Аднак Бібліятэка Нью-Ёркскага таварыства заявіла, што яна гатова прабачыць штраф – абы кнігі вярнулі. Зрэшты, дзе гэтыя кнігі, зараз ніхто не ведае.

## Літва адмовілася Беларусь называць Belarus

***У Літве Беларусь не будуць называць Belarus. Такое рашэнне прыняла Дзяржаўная камісія па літоўскай мове, разгледзеўшы зварот МЗС Беларусі.***

*«Камісія па літоўскай мове, вывучыўшы меркаванне літоўскіх гісторыкаў, прыняла рашэнне пакінуць ранейшы варыянт – Baltarusija – нягледзячы на тое, што гэта спадчына савецкага часу»,* – сказала старшыня камісіі Ірэна Сметонене.

Па яе словах, беларускі бок «вельмі карэктна» цікавіўся, якім чынам назва Рэспублікі Беларусь магла б адбіцца ў літоўскай мове.

*«Мы прынялі да ўвагі меркаванне гісторыкаў. Літоўскі інстытут гісторыі накіраваў нам свой ліст, у якім гаворыцца, што так, была калісьці Baltoji Rusia (Белая Русь), і што назва Baltarusija – гэта спадчына савецкіх часоў, але яна ўжо стала традыцыйнай. Іншы ліст прыйшоў з Віленскага універсітэта, у ім казалася, што большасць навукоўцаў факультэта гісторыі трымаюцца думкі, што немэтазгодна мяняць назву суседняй краіны і раяць працягваць называць яе Baltarusijos Respublika – скарочана Baltarusija. Мы з гэтым меркаваннем згодныя, усё-такі без вялікай неабходнасці мяняць назву краіны не варта»,* – сказала І. Сметонене.

Застаецца таксама і традыцыйная назва Gudija.

## Самые глупые оправдания нарушителей ПДД

***Администрация лондонского округа Саутворк обнародовала список самых глупых оправданий, которые чиновники слышали от оштрафованных нарушителей правил дорожного движения за последние два года.***

Один мужчина заявил, что не следовало выписывать ему штрафную квитанцию за парковку в неположенном месте, поскольку он спал на заднем сиденье автомобиля, накрывшись одеялом с головой, и можно было разбудить его и попросить переставить машину. Другой нарушитель сказал, что остановился в неположенном месте, потому что его собаке надо было срочно сходить в туалет.

Женщина, которую поймали на том, что она не пристегнулась ремнем безопасности, сказала, что работает стриптизершей, а ремень цепляется за ее пирсинг. Еще один нарушитель заявил, что разогнал автомобиль до высокой скорости, чтобы летавшая вокруг его головы пчела отстала и осталась в районе задних сидений.

Один припарковавшийся в неположенном месте британец объяснил это тем, что его загипнотизировали. Другой водитель, оштрафованный за слишком быструю езду, сказал, что приборы зафиксировали не скорость его автомобиля, а скорость пролетавшего в этот момент самолета.

В список оправданий нарушителей попали также щенки, попугаи, НЛО, сварливые тещи и плохая погода.

***По материалам belmy.info, nn.by, lenta.ru, Euronews***

# КАТЫНСКІЯ ТРАГЕДЫІ

***10 красавіка 2010 г. самалёт прэзідэнта Польшчы Леха Качынскага разбіўся на пасадцы каля ваеннага аэрапорту Паўночны пад Смаленскам. Загінулі 96 чалавек. У іх ліку сам прэзідэнт, яго жонка, кіраўнік вайсковага штабу, міністр фінансаў, віцэпрэмьеры і віцэспікеры.***

Дэлегацыя накіроўвалася на ўшанаванне 70-годдзя растрэлу савецкімі НКУСаўцамі 4000 (па польскіх падліках да 12000) інтэрніраваных ваеннапалонных польскіх афіцэраў у Катынскім лесе пад Смаленскам. Сярод іх было каля 2000 жыхароў Заходняй Беларусі, якім перад вайной непашчасціла хацець атрымаць зямлі, як асаднікам. Тая трагедыя дагэтуль сапраўды востра ўспрымаецца польскім грамадствам, паглядзіце напрыклад выдатны фільм «Катынь» А. Вайды, а тут яшчэ і гэта гора. Вось ужо сапраўды кепскае месца для палякаў!

Абставіны катастрофы хутчэй за ўсё выглядалі наступным чынам. У Смаленску з раніцы быў туман і кепскае надвор'е. Дыспечарскае суправаджэнне прапанавала польскаму борту № 1 сесці пачакаць у Мінску альбо ў Маскве, але тыя адмовіліся. Праігнаравалі яны папярэджанні і забарону на пасадку смаленскага аэрапорта. Хутчэй за ўсё, капітан выконваў загады прэзідэнта, які хацеў укласціся ў рэгламент. Папярэдні экіпаж, які адмовіўся ляцець праз расейскія ПВА падчас жнівеньскай руска-грузінскай вайны, быў звольнены. Любы самалёт можа разбіцца на пасадцы ў туман. Па заключэнні камісіі тэхнічных непаладак не было, паліва хапала, пілот зусім трохі адхіліўся ад траекторыі. На заходзе на пасадку самалёт зачапіўся за дрэвы, разбіўся і згарэў. Выпадак сапраўды трагічны. Шчыра спачуваем.

Цэлы тыдзень Польшча была ў смутку, натоўпы варшавякаў прыходзілі развітацца. Пару Качынскіх пахавалі ў кафедральным саборы на гары Вавель у Кракаве. Рытарычным засталося пытанне, ці месца па статусе і гістарычных заслугах трэцяму прэзідэнту побач з пахаваннямі польскіх каралёў, А. Міцкевічам і Ю. Пілсудскім.

***Ваўчара***

# ІНІЦЫЯТЫВА ПА АДМОВЕ АД ЗАВОЧНАЙ АДУКАЦЫІ НЕ ЗНАЙШЛА ПАДТРЫМКІ ВА ЎРАДЗЕ

***Міністэрства адукацыі не зьбіраецца адмаўляцца ад завочнай формы навучаньня. Але дыскусія аб адыходзе ад завочнай, распачатай дэпутатам Уладзімерам Здановічам, працягваецца.***

Напачатку вясны старшыня камісіі палаты прадстаўнікоў па адукацыі Ўладзімір Здановіч чарговы раз заявіў, што ад завочнай формы адукацыі варта пазбаўляцца. Галоўны аргумэнт – узровень ведаў завочнікаў саступае ўзроўню студэнтаў вочных аддзяленьняў.

Мінадукацыі вырашыла, што скарачаць набор на завочныя месцы ня будзе. *«Усё адрэгулюе рынак»,* – так камэнтуе дэпутат адсутнасьць жаданьня беларускіх чыноўнікаў пазбаўляцца ад завочнай адукацыі.

Але як адзначае ў сваім блогу дацэнт БНТУ Аляксандр Кавалёў, з гэтага году Міністэрства адукацыі будзе «даводзіць» да ўнівэрсытэтаў ня толькі пляны па набору на бюджэтныя і платныя месцы вочных аддзяленьняў, але і лічбы па набору на завочнае. Раней такога не было.

Уладзімер Здановіч спасылаецца на прыклады *«вядучых ВНУ Расеі, дзе прыём на завочную форму скарачаюць, а ў пэрспэктыве і наогул хочуць ад яе адмовіцца».* Але як нядаўна адзначыў міністар адукацыі Расеі, у гэтай краіне ў хуткім часе колькасьць студэнтаў з-за дэмаграфічных праблем скароціцца зь цяперашніх 7.5 да 5.5 мільёнаў чалавек.

Дэмаграфічны чыньнік, на думку былога прарэктара Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту Уладзімера Дунаева, грае істотную ролю і ў Беларусі:

*«Дэмаграфічныя працэсы, якія адбываюцца ў краіне і вядуць да дэпапуляцыі, пазбаўляюць вышэйшую школу значнай часткі студэнтаў, – кажа Уладзімір Дунаеў. – Адукацыйны працэс неабходна перабудоўваць: альбо рабіць акцэнт на масавым прыцягненьні замежных студэнтаў, што сёньня з-за неканкурэнтаздольнасьці беларускага дыплёму наўрад ці магчыма, альбо разьвіваць формы адукацыі для дарослых, дзе разнавіднасьці завочнай і дыстанцыйнай адукацыі будуць вельмі запатрабаваныя».*

Магчымай заменай завочнай адукацыі можа стаць дыстанцыйная форма, якая ў Беларусі пасьпяхова выкарыстоўваецца толькі ў БДУІРы. Яшчэ ў 2005 годзе колькасьць студэнтаў дыстанцыйнай формы навучаньня ў сьвеце перавысіла колькасьць тых, хто навучаўся вочна.

У Эўрапейскім Зьвязе колькасьць студэнтаў такой формы навучаньня складае каля 30 %, у Расеі – да 3 %. У Беларусі дыстанцыйна навучаюцца менш за 1 % студэнтаў, у той час як на завочнай 237 тысяч чалавек – амаль кожны другі студэнт.

***Па матэрыялах generation.by***

# ПГУ НА 6 МЕСТЕ ПО ИНДЕКСУ ЦИТИРОВАНИЯ YANDEX.RU

***Если верить российскому поисковому каталогу Yandex.ru, а ему трудно не верить, страница нашего университета занимает 6-е место по индексу цитирования среди белорусских вузов, обогнав такие учебные заведения как: Академия управления при президенте, БНТУ, Белорусский медицинский университет, Витебский университет и знаменитая могилевская машинка, нынешний Могилевский университет.***

Тройка лидеров выглядит следующим образом: 1-е место БГУ, 2-е место Белорусский экономический университет (БГЭУ), 3-е место Брестский государственный университет. На 4-м и 5-м местах расположились Брестский государственный технический университет и Университет информатики и радиоэлектроники соответственно. Сайт первого среди белорусских вузов — БГУ, занимает лишь 51-е место в общемировом рейтинге цитируемости YANDEX.RU, обогнав на две позиции страницу Кембриджского университета, занявшую 53 место соответственно.

***Ozz***

# ШОУ НА ЛЬДУ

***Как неоднократно писал MAKASIN, в действиях руководства нашего университета четко прослеживаются государственные тенденции. Это и реконструкция здания университетской библиотеки, и инновационные технологии параллельного ремонта, и много еще чего интересного и прогрессивного.***




Но каково было удивление, смешанное с гордостью, когда ни с того ни с сего закрыли проход по второму этажу главного корпуса. Ладно, если бы его просто закрыли по причине ремонта – никто бы не удивился. Все бы решили, что технология параллельного ремонта доводится до совершенства, дабы внедрять передовой опыт в другие вузы страны. Так нет. Учитывая общегосударственные тенденции, направленные на пропаганду здорового образа жизни, хоккея и прочих ледовых видов спорта, было решено положить на пол покрытие, приближенное по своему свойству к настоящему льду. И теперь студентам, преподавателям и другим работникам университета будет незачем тратить свои кровные деньги на поход в тот же «Химик». Наслаждаться прелестями ледовых видов спорта и отдыха можно будет прямо в университете. Кстати, одной из возможных причин, по которым выбрали второй этаж, может быть создание в нашем вузе керлинг клуба. А что, место подходящее, освещение соответствующее уже почти сделали. Осталось только инвентарь закупить и команду набрать. Да и керлинг, как вид спорта, больше чем другие подходит под формат учебного заведения. Спокойный, несуетливый, академический одним словом. Если все пойдет как надо, глядишь, в фойе нового корпуса искусственный газон для гольфа положат. Вы только представьте броские заголовки местных и республиканских СМИ: «Первый открытый чемпионат по керлингу состоялся в стенах ПГУ», или «Звезды белорусского гольфа съехались в ПГУ на открытие первой закрытой площадки». Впечатляет, не правда ли?

# ФОТОГРАФИЯ ПО-УНИВЕРСИТЕТСКИ

***20 апреля закончился прием работ на ежегодный университетский конкурс фотографии «Университет в объективе».***




Приятен факт, что студенческий актив уделяет внимание творческому развитию студентов и работников университета. Действительно, фотография сегодня – это одно из самых популярных хобби. Доступности, с которой современный человек создает отпечатки реальности, позавидовал бы любой фотограф прошлого. Но, как это ни печально, доступность отнюдь не обозначает улучшения общего уровня фотографии. К сожалению, легко предположить, что фотографии, поданные на конкурс, практически ничем не будут отличаться от прошлогодних или позапрошлогодних. Скажете что конкурс любительский? Отчасти будете правы, но лишь отчасти. Однако, любой конкурс предполагает развитие, обмен мнениями, а итоговая выставка отражает работу жюри. Жаль, но в университетском конкурсе ничего этого, на мой взгляд самого важного, нет. И очень жаль, потому что для того, чтобы появилось компетентное жюри и прошел семинар по итогам не нужно ходить далеко. Резервы и кадры для этого в университете есть. Это и декан историко-филологического факультета, и работники кафедры мировой литературы и культурологии, кафедра архитектуры – вот те люди, кто мог бы дать нормальную оценку и показать путь развития фотографам-любителям. Кроме того, в городе есть фотоклуб. Все-таки университет должен оставаться университетом и каждое действие от его имени, будь то конкурс или концерт, должно носить законченный вид и включать в себя элементы обучения и развития личности. И почему у нас прекрасно получается каждый год на 1 сентября приглашать белорусских поп-звезд, а нормально провести фотоконкурс – нет?

# ГРЯДУЩЕЙ ВАЛЬПУРГИЕВОЙ НОЧИ ПОСВЯЩАЕТСЯ ИЛИ МАЛЕНЬКИЙ ЛИКБЕЗ ПО ПОВОДУ ГЛАВНЫХ КЕЛЬТСКИХ ПРАЗДНИКОВ

***Сегодня каждой твари будет невмочь***
***Сегодня слуги дьявола хоронят свою дочь***
***Сегодня настаёт Вальпургиева ночь.***
**(из песни группы «Сектор Газа»)**

**С**овсем уже скоро наступят майские праздники. В этом году они пришлись неудачно - что 1-го мая, что 9-го – выходные. Однако почти вплотную к празднику Первомая (День солидарности трудящихся в борьбе с капиталистами, если кто вдруг не в курсе) примыкает широко известный в узких кругах день памяти св. Вальпурги или св. Вальпургии. Память этой святой католическая церковь отмечает как раз 1 мая. Если мы заглянем в житие св. Вальпургии, то не увидим ничего загадочного или странного – обычное житие. Аббатиса совершила несколько чудес при жизни, прославилась праведностью, множество чудес после смерти. Нет ничего, что выбивалось бы за рамки стандарта. И сам праздник в католическом календаре ничем особенным не выделяется – в любой день года церковь вспоминает как минимум двух-трех святых (а бывает что и пять-десять). Но в народе уже много лет рассказывают, что именно в эту ночь ведьмы слетаются на шабаш. Со всех сторон собираются они на горах – немецкие ведьмы на гору Брокен, славянские – на знаменитую Лысую гору что под Киевом. По дороге они – ну естественно! – учиняют всякие безобразия: молоко украдут, людей напугают, а то и просто бросят чего-нибудь на голову. Ведьмы-то на шабаш по воздуху добираются! Ну а что на самом шабаше творится – это вообще за всякие рамки выходит. Тут и оргии, и пьянства, и людоедство, и общение с самим Дьяволом. Вальпургиева ночь, одним словом.

У вдумчивого читателя уже возник вопрос – а почему, собственно, такая мирная святая связалась со всем эти непотребием? Чтобы ответить на него нужно знать, что христианство возникло в Европе не на пустом месте. Много тысячелетий языческие жрецы вершили свои обряды и творили магию, тысячи тысяч раз люди справляли языческие праздники. Христианство просто не могло всё это перечеркнуть, невозможно было бороться с памятью народной. Священникам римской церкви пришлось приспосабливаться. И старые языческие праздники появились в христианском календаре. Что может быть проще, чем поменять название? Был праздник в честь богини Бригитт, стал день св. Бригитты! Был праздник Бальдра, стал день Иоанна Крестителя. Так же и день памяти святой Вальпурги – когда-то давно он назывался Бельтайн.

Само слово Бельтайн – кельтское. Истоки этого праздника теряются во тьме веков. В те дальние времена всю Европу населял воинственный и поэтичный народ кельтов. Или, как их называли римляне, галлов. Да-да, Остерикс и Обеликс из популярных фильмов и мультфильмов, друиды, календари, первые в Европе железные мечи, боевая раскраска (Мел Гибсон в «Храбром сердце») – это всё про них. Жили кельты по всей западной Европе (даже до территории Беларуси, вроде бы, добирались). Среди прочих своих достижений кельты оставили наследникам – германским племенам, а потом и христианам – и свой календарь.




Кельтский календарь был привязан к четырём важнейшим небесным событиям. Это два равноденствия – когда день равняется ночи – 21 марта и 21 сентября. И два солнцестояния – самый длинный день 22 июня и самая длинная ночь 22 декабря. Все эти дни стали важнейшими праздниками у кельтов. «Однако же, постойте!» - скажет внимательный читатель. «1 мая не является ни равноденствием, ни солнцестоянием! Причём тут кельтская традиция?» Дело в том, что кельты добавили к четырём праздникам, привязанным к ключевым положениям солнца, ещё четыре праздника. Каждый из них делил отрезок времени между солнцестоянием и равноденствием пополам. Всего, таким образом, получилось восемь праздников. Вот они.

Самым первым идёт **Йоль**. Этот праздник отмечается на зимнее солнцестояние – самый короткий день и самая длинная ночь. Но с этого времени день начнёт расти – и это праздник радостный, светлый. Не случайно именно к нему церковь приурочила праздник Рождества Христова – язычники задолго до этого события отмечали рождение юного божества. В этот день все поздравляли друг друга с началом нового года, новой жизни.

Следующий праздник назывался **Имболк**. Отмечали его 2 февраля. К этому времени уже заметно увеличение дня. А это значит, что молодой бог, родившийся на Йоль, продолжает расти. Вместе с его ростом, растёт и продолжительность дня. Понятно, что сейчас, когда всюду электричество, когда люди вообще не видят Ночи, радость от маленького увеличения дня кажется непонятной. Но представьте, что электричества нет. Весь свет в доме – печка и лучина (длинная деревянная щепочка). Много при таком освещении насидишь? Поэтому и спать зимой ложились чуть ли не в пять часов вечера. Поэтому и радовались каждой светлой минуте. В этот день было принято зажигать свечи, костры, факела – всё, что даёт свет. Делалось это для того, чтобы помочь юному богу освещать мир.

Праздник **Остара** отмечался 21 марта, в день весеннего равноденствия. С этого времени день длиннее ночи (не смотрите на часы, живите по природному времени). А это значит, что началась весна. Настоящая весна. Юный бог уже вырос и дарит жизнь травам и деревьям. Всё в окружающем мире пробуждается, природа просыпается после зимнего сна. «Ручеёк бежит быстрей, солнце стало выше…»

**Бельтайн**, с которого мы и начали разговор, празднуется 30 апреля. В это время природа пробудилась окончательно. Хотя наш календарь и не выделяет этот период, но все знают, что такое май – соловьи, молодая листва, цветы… Молодой бог, рождение которого мы отмечали в Йоль, теперь не юноша, но муж. Именно в это время он берёт в супруги богиню. Они теперь вместе и вся природа ищет себя в любви – у людей, зверей и птиц идут брачные игры. Вполне возможно, что именно этот момент повлиял на формирование идеи шабаша.

В день летнего солнцестояния – 21 июня – отмечается праздник **Лита.** У нас он известен как праздник Купалы (настоящее Купалье должно отмечаться именно с 21 на 22 июня, а не 7 июля). Сила плодородия в это время достигает высшей точки, всё лучится силой. Именно в этот день люди превращаются в волков, цветут тайные травы (вроде папоротника, которые даёт знание языков и кладов), самое лучшее время для магии.

1 августа отмечается **Лугнасад** (или, как ещё говорят, Лагнасад). Время созревания первых плодов, начи-

нается сбор урожая. Природа уже не столько ярится, бурлит, сколько плодоносит. Но день начинает укорачиваться – бог начинает терять силу, стареть… Все знают это странное ощущение конца лета: плоды, солнце, лёгкая грусть, которая теряется в радости.

В день осеннего равноденствия (21 сентября) отмечают праздник **Мабон**. Завершается уборка урожая, лето закончено. С этого дня ночь будет становиться всё длиннее. Бог стареет, он уже готов умереть. Немного печально смотреть на жёлтые листья, которые готовы оставить ветви и упасть на землю. И нас со временем закружит листопад…

31 октября или 1 ноября проходит праздник **Самхейн**. В этот день бог умирает, он уходит в смерть, чтобы вновь родиться на Йоль. Поэтому Самхейн – праздник смерти. В это время поминают умерших – они нередко пользуются возможностью, чтобы в этот день навестить живых потомков. Не случайно 2 ноября у нас проходят Дзяды – чествование умерших родичей. Но врата между мирами открыты и проходят через них не только благожелательные предки. Из иных миров могут придти и опасные существа – надо жечь костры, надо всячески отпугивать нечисть. Поэтому на Самхейн переодевались кто во что горазд и мазали лица сажей и краской – старались обмануть злобных демонов. Именно отсюда берут свои начала традиции известного всем Хэллоуина. Хотя из современных ряженых мало кто может сказать, почему НЕОБХОДИМ весь этот карнавал.

Такие вот кельтские праздники. Схематично изображённые на годовом круге они образуют колесо с восемью спицами. Этот знак использовался как символ года, как символ времени, как символ солнца (можете носить, если нравится). Древние кельтские праздники долгое время скрывались под христианскими масками церковного календаря. А уже в 20 веке их восстановили и стали отмечать новые язычники и последователи разного рода магических учений, Викки, например. Поэтому не удивляйтесь особенно, если увидите на Бельтайн весёлых ведьм, которые собираются почтить брак Бога и Богини соответствующими ритуалами.

***Карлюза***

# БЕЛАРУСКАЕ СВЯТА Ў ГОНАР МЯДЗВЕДЗЯ

***Свята адзначалася беларусамі 6 красавіка (24 сакавіка па старым стылі), якраз напярэдадні Благавешчання, або Звеставання, і атрымала незвычайную назву – Камаедзіца.***

*Таптыгін, Іван Іваныч, Іван Патапыч, Касалапы, Ушкуй* – як толькі не называюць мядзведзя ў народных паданнях, казках і прыказках. Звярніце ўвагу на тое, што толькі мядзведзя называюць так разнастайна. Мядзведзь карыстаўся асаблівай пашанай сярод усходніх славян. З аднаго боку, моцная жывёла выклікала захапленне; з другога – здольнасць хадзіць на задніх лапах правакавала параўнанне яго з чалавекам і надзяляла незвычайнай магічнай сілай. У паданнях мядзведзь і чалавек лічыліся сваякамі, паколькі верылі, што некалі чалавек быў ператвораны ў мядзведзя, яго лапы – як чалавечыя рукі; ён ходзіць на дзвюх нагах, мыецца, любіць мёд і гарэлку, клапоціцца пра сваіх дзяцей, разумее чалавечую мову і нават смокча лапу, як дзіця. (Між іншым, тое, што мядзведзь смокча лапу, выклікана біялагічнай асаблівасцю гэтага звера: вясной скура з яго лап злазіць, а таму свярбіць і чэшацца. Каб аблегчыць працэс абнаўлення скуры, мядзведзь злізвае старую, каб хутчэй нарасла новая).



Паводле ўяўленняў беларусаў, мядзведзь, які прыйшоў у вёску, – да шчасця, таму што ён ведае *«у якога гаспадара павінна здарыцца няшчасце, і забярэ гэтае няшчасце з сабою»*. У старажытныя часы паляванне на мядзведзя было забаронена. Святасць у адносінах да гэтай жывёлы таксама забараняла ўжываць яго мяса і шыць адзенне з яго шкуры. Не дапускалася і проста ўзгадваць мядзведзя ў звычайнай размове. Лічылася, што гэта моцная і грозная жывёліна імгненна адзавецца і з’явіцца побач. Таму ў гутарковай мове ўладара мясцовых лясоў часцей за ўсё называлі такімі словамі, *як «сам», «гаспадар», «дзядуля», «млынар», «лешы», «касматы», «аўсяннік», «бортнік», «касалапы»*. Ды і сама назва ***«мядзведзь»*** узнікла з-за той самай падмены слоў, якія яго характарызуюць: ведзьмед – ведае, дзе мёд.

Паганскае свята пакланення мядзведзю, зафіксаванае ў мінулым стагоддзі ў Бягомльскім раёне (Віцебшчына). У гэты дзень гатавалі асобную ежу, менавіта: на першую страву – сушаны рэпнік у гонар таго, што мядзведзь харчуецца пераважна раслінным кормам, травамі; на другое падаваўся кісель, бо звер любіць авёс; трэцяя страва складалася з гарохавых камоў, ад якіх і само свята атрымала назву ***Камаедзіцы.***

Пасля абеду ўсе – і старыя, і малыя – кладзіся адпачываць, але не спалі, а час ад часу пераварочваліся з боку на бок, нібы мядзведзь у бярлозе. Цырымонія расцягвалася каля дзвюх гадзін – усё рабілася дзеля таго, каб мядзведзь лёгка падняўся пасля зімовага сну. Пазней гэтыя качанні ператварыліся ў вяселыя забавы на свежым паветры, калі моладзь «качала» адзін аднаго ў гурбах, кідалася снегам ды каталася з гор (кубарам альбо, пазней, на санках). Паводле павер’я, мядзведзь у гэты дзень абуджаецца ад спячкі. Выходзіць са сваёй бярлогі. Вось і сустракалі яго гэтак добразычліва.

Існавала прыкмета: калі мядзведзь, разбуджаны веснавым цяплом, выйдзе з бярлогі і ўбачыць свой цень, то ён вернецца назад і праспіць яшчэ сорак дзён, бо столькі будуць працягвацца замаразкі. Канчаткова мядзведзь пакідаў сваю зімовую бярлогу 7 красавіка – на Благавешчанне.

Асаблівая ўвага ў гэты дзень надавалася маладым парам, якія ажаніліся ў мінулым годзе. Лічылася, што толькі цяпер, разам з абуджэннем прыроды і пачаткам новага года, пачынаецца іх шлюб. А каб жыццё іх было ладным ды лёгкім – «адбывалі» маладыя ўсе клопаты ды цяжкасці на гэтых самых снегавых забавах, дзе толькі і глядзі, то з гары штурхнуць, то снежкай запуляць, то ў гурбе выкачаюць дабразычлівыя і поўныя энергіі сябры ды сяброўкі. На добры лад маладым дарылі падарункі, частавалі аладкамі ды кашай, ды яшчэ і прымушалі цалавацца перад усімі (мабыць, дзесьці тут ёсць корані вядомага нам і зараз вясельнага «горка!»).

Абавязковымі ўдзельнікамі абрадавых забаў былі людзі, перапранутыя мядзьведзямі. З гэтай мэтай яны апраналі вывернутыя тулупы ці нават сапраўдныя мядзвежыя шкуры. Яны павінны былі быць увесь час на віду, танчыць ды гуляць разам з усімі. Насамрэч гэта не такая і лёгкая справа – паспрабуй ты ўвесь дзень актыўна бавіць час у цяжкай «шубе» – вытрымаць такое маглі толькі самыя дужыя ды моцныя, таму нездарма яны лічыліся самымі завіднымі жаніхамі ды лепшымі работнікамі.

Пачатак свята бярэ, без сумнення, ад часоў дахрысціянскіх і служыць верагоднай дакументацыяй таго, што ў дадзенай мясцовасці пакланяліся мядзведзю. Па ўспамінах старажылаў, у гэтым рэгіёне некалі былі магутныя лясы і непраходныя нетры, дзе вялося мноства дзікіх звяроў. Мядзведзь, які вылучаўся сваёй сілаю, ростам, наводзіў страх на людзей. Каб задобрыць яго, людзі і прыдумалі звычай ушаноўваць мядзведзя.

***Ульляна Полацкая***

**СІНДРОМ РАПТОЎНАЙ СЬМЕРЦІ**

Сюжэтны тупік; незажыўлены шнар,
якога з аблічча ня зьдзерці;
тады рэжысэр выпраўляе сцэнар
сіндромам раптоўнае сьмерці.

Закінуты сквер як балотны аер.
Чужы лістападаўскі горад
маршрутам нязнаным выводзіць яе
пад вокны каханкі ягонай.

Ні злосьці, ні рэўнасьці ашалелай –
спроба пазбавіцца болю,
спатоліць тугу незнаёмых, але
адной аб’яднаных любоўю.

А той, – ліхтароў мірганулі агні, –
сюжэтам прыбраны далёка, –
пачуць іх ня можа, убачыць ані
праз даўкую вату аблокаў.

**НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ**

Ня болей за ілюзію адчай,
нібыта лёс атручаны мінулым,
бо можна новае жыцьцё пачаць:
прайсьці да гаража дваром паснулым,

завесьці рухавік, прыбіўшы сон
аскомай распушчальнай кавы ў роце,
на трасе разагнацца да дзьвюхсот
і не круціць стырно на павароце.



**РАНІЦА**

Ашчадна сьвеціцца вакно
калі прачнуцца да відна
як чорна-белае кіно
бязгучнае:
сьпіны сьцяна,

раскрытай даланёй рука,
рэльеф западзінаў вачэй,
пакуль сутонная рака
канапы рэчышчам цячэ,

але брыняюць гарачэй,
касуюць манахром начы
нос,
губы,
ранішняя шчэць,
прышчэпка воспы на плячы.

## Югася Каляда

Сапраўднае імя **Яўгенія Парашчанка**.

Беларуская пісьменьніца.

Нарадзілася 10 лютага 1981г. ў Гомелі. Скончыла гістфак Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэту. Навучалася на юрфаку інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва. Піша прозу, закладаючы ў яе ладны кавалак правакацый.

У 2004 годзе стала адной зь пераможцаў конкурсу маладых літаратараў імя Пэтраркі, які ладзіўся Беларускім ПЭН-цэнтрам. У 2005 годзе выйшла першая кніжка ейнай прозы «Галоўная памылка Афанасія», якую філёзаф Ігар Бабкоў назваў «самым скандальным і кантравэрсійным літаратурным дэбютам дзесяцігодзьдзя».

Творы Югасі Каляды выразна эгацэнтрычныя. Аўтабіяграфічныя пасажы пісьменьніца шчыльна пераплятае з ірэальнасьцю сноў, фантазіяў ды канспэктаў ненапісаных раманаў. У пачатку 2007 году «Галоўная памылка Афанасія» зьявілася ў перакладзе на польскую мову. Кніга атрымала назву «Traktor».

# НЕНУЖНАЯ СТАТИСТИКА

***Излюбленный вопрос кассиров в банке «Билетик купить не желаете?». А в университете вам на группу еще не выдали план по обязательному количеству приобретенных лотерейных билетов? Наши статисты с государством в игры не играют, потому лотереей не увлекаются, но слишком уж интересно, какими «халявами», на взгляд студентов, можно разжиться при игре в лотерею.***

**ЧТО МОЖНО ВЫИГРАТЬ В ЛОТЕРЕЮ?**




1 – второй билетик
2 – в неё можно выиграть?
3 – кто возьмет билетов пачку, тот получит водокачку
4 – зависимость от игры в лотерею

**П**охоже, что скептически настроена наша братия к массовым игрищам. Второй билетик, водокачка… а ведь за счет покупки лотерейных билетиков бюджет РБ полнится!

Вариант 35 % опрошенных о возможной зависимости от игры в лотерею наводит на мысль о богатом лотерейном опыте…а вы еще не просили друзей в Минске купить вам столичный билетик?

# СУМНА?

**Н**ават страшна падумаць, на што яшчэ здольны ісландцы, калі ім так і не даруюць 4-х міліярдную пазыку.

***

Пад час пераключэньня каналаў патрапіў на тэлекраму... Зараз не ўяўляю свайго жыцьця без бананачысткі за 250 000 рублёў.

***

Да што я за бэрмэн, калі я з адной паўлітры не налію чатыры па 150.

***

Глупства, вымаўленае чалавекам, з`яўляецца яго інтэлектуальнай маёмасьцю.

**Наклад: 299 ас.**
**бясплатна**

Заснавана ў 2004 годзе. Выдаецца на правах рукапісу.
Думкі аўтараў могуць не супадаць з нашым уласным меркаваньнем.
Матэрыялы падаюцца на мове аўтараў.
**Харошыя людзі:** М.Азарова, Н.Сарокіна, В.Лобаў, В.Сублім.
**www.makasin.info** | **e-mail:** hazeta@gmail.com |
Надрукавана на асабістым абсталяваньні